скажешь, например, о чтении книги), не дает зрителю времени осмыслить, одуматься; и сообщение, и его значение проходят во многом через бессознательное, минуя рациональные механизмы» [1, с. 580].

В настоящее время в телевизионном сегменте национального информационного поля, согласно мониторинговым социологическим исследованиям, прослеживается тенденция количественного уменьшения телеаудитории. Вместе с тем, телевизионный формат потребления массовой информации по-прежнему остается доминирующим ввиду высокой частоты просмотра телевизионных передач. Указанная тенденция, на наш взгляд, будет продолжать сохраняться в среднесрочной перспективе.

**Библиографические ссылки**

1. Шейнов В. П. Манипулирование сознанием. Минск : Харвест, 2011. 768 с.

# РАДЫЁБЛОГ ЯК НОВАЯ ФОРМА РАЗМОВЫ СА СЛУХАЧОМ

***А. А. Смірнова***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*berezovskayae@mail.ru*

У артыкуле разглядаюцца новыя формы ўзаемадзеяння радыё са слухачом, у прыватнасці, радыёблогі. Аднак нават у сучасным паняцці – блог – ёсць традыцыйная аснова. Так, радыёблог вельмі блізкі па сваіх тыпалагічных характарыстыках да радыёпрамовы, якая доўгі час была адным з самым папулярных радыёжанраў.

***Ключавыя словы:*** радыёжанр; радыёформа; радыёблог; радыёпрамова.

# RADIO BLOG AS A NEW FORM OF COMMUNICATION WITH THE RADIO LISTENER

***A. A. Smirnova***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str, 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: A. A. Smirnova (berezovskayae@mail.ru)*

The article discusses new forms of radio interaction with the listener. Radio is looking for modern approaches. But even in the modern concept – a blog –

there is a traditional basis. Thus, the radio blog is very close in its typological characteristics to a radio speech, which has long been one of the most popular radio genres.

***Keywords:*** radio genre; radio form; radio blog; radio talk.

Звычайна тэрмін «блог» можна пачуць у дачыненні да вэбжурналістыкі. Асобна вылучаюцца відэаблогі (влогі). Па сваіх функцыянальных магчымасцях і тэматычнай разнастайнасці блогі канкуруюць часам з традыцыйнымі сродкамі масавай інфармацыі, прычым як па аператыўнасці, так і па змястоўнасці напаўнення. Блог мае свае тыповыя характарыстыкі. Па-першае, гэта інтэрактыўнасць, магчымасць аўдыторыі пэўным чынам уплываць на змест, пакідаць водгукі, каментары. Па-другое, рэгулярнасць: у прафесіянальных блогераў абавязкова ёсць кантэнт-план. Па-трэцяе, для блога звычайна характэрны большая нефармальнасць, чым для традыцыйных медыя, шчырасць, персаналізацыя.

У межах барацьбы за аўдыторыю радыё таксама шукае новыя формы ўзаемадзення са слухачом. Адна з такіх формаў – гэта радыёблог. У беларускім эфіры радыёблогі рыхтуюць журналісты Першага канала Беларускага радыё. У апісанні праекта на сайце Белтэлерадыёкампаніі значыцца, што гэта «аналітычная праграма-развага па актуальных падзеях і з’явах паўсядзённага жыцця». Характэрна, што ў праекце заняты вопытныя радыёжурналісты: Валерый Радуцкі, Леанід Новікаў, Навум Гальпяровіч, Галіна Шаблінская і інш. Тэматычнай нагодай для запісу радыёблога становяцца самыя розныя падзеі. Так, на пачатку новага навучальнага года сваімі думкамі пра адукацыю падзяліўся Леанід Новікаў («Вердыкт. Новы навучальны год – з новымі падыходамі!»). Чарговы даклад ААН аб шчасці лёг у аснову радыёблога Дзмітрыя Рубашнага «Паралелі. Простыя сакрэты шчасця». Вельмі шчырым і лірычным атрымаўся радыёблог Навума Гальпяровіча, прысвечаны працы хлебаробаў «Роздум. Стварэнне хлеба», бо аўтар расказвае пра сваё жыццё: «Памятаю, бабуля пасылала мяне ў краму па свежы хлеб…».

Радыёблог вельмі блізкі да такога жанра як радыёпрамова (радыёзварот, публіцыстычные выступленне, радыёслова), які раней быў вельмі папулярным у радыёэфіры. Аднак тэндэнцыя да дыялагізацыі эфіру паступова выкрэсліла гэты жанр з эфіру. Адна з задач радыёпрамовы была якраз – вынесці на суд грамадскасці праблему сацы-

яльнага жыцця, прапушчаную праз розум і сэрца аўтара, выяўленую ў яскравай публіцыстычнай форме. Ці можна лічыць радыёблог радыёпрамовай? У пэўным сэнсе так. Але з радыёпрамовамі часцей за ўсё выступалі буйныя палітычныя і грамадскія дзеячы, пісьменнікі, прычым радыёпрамова як высокая форма радыёпубліцыстыкі атрымлівала сваё шырокае ўвасабленне падчас буйных сацыяльных узрушэнняў. Радыёпрамова была запатрабаваная тады, калі неабходна прамое эмацыянальнае ўздзеянне на аўдыторыю. Агульнымі рысамі радыёблога і радыёпрамовы можна лічыць наступныя: маналагічнасць, шчырасць, персаналізацыя, эмацыянальнасць. Ці карэктна параўноўваць жанр і форму ў такім кантэксце? Так, паколькі формаўтваральныя пытанні ў дадзеным выпадку спрэчныя.

Выкарыстанне больш новага тэрміну ў дачыненні да маналагічнага выступлення журналіста ля мікрафона можна растлумачыць тым, што радыё, вядома, імкнецца да больш сучасных спосабаў узаемадзеяння са слухачом. Але тут трэба зыходзіць з патрабаванняў і сацыяльна-дэмаграфічнай характарыстыкі мэтавай аўдыторыі, каб не атрымалася, што ў пагоні за сучаснасцю радыёканал губляе свайго слухача, для якога «блог» і «блогеры» маюць негатыўныя канатацыі.

## ТЕЛЕВИЗИОННОЕ КИНО В БЕЛАРУСИ: БЫТЬ ИЛИ НЕ БЫТЬ?!

***Н. Г. Стежко***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская 9, 220004, Минск, Республика Беларусь,*
*natste@rambler.ru*

Приводится мнение, что не только новости или информационно-публицистические передачи на политические темы создают положительный имидж государства, но и художественное вещание, в частности, телекино. Определяется, что если документальное кино и докудрама сегодня широко представлены в белорусском эфире, то игровое телевизионное кино не получило своего развития. Отмечено, что за таким контентом будущее и его следует осваивать.

***Ключевые слова:*** телекино; художественное вещание; документальное кино; докудрама.